УДК 808.26-3(043.3)

# Асноўныя прыёмы ўтварэння энергетычных тэрмінаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове

Пятрова Н.Я.
Беларускі нацыянальны тэхнічыны ўніверсітэт

Энергетычныя тэрміны ўтвараюцца паводле спосабаў словаўтварэння беларускай літаратурнай мовы: марфалагічнага, семантычнага і сінтаксічнага.

**Марфалагічны спосаб** утварэння з'яўляецца найбольш прадуктыўным. Для стварэння энергетычных тэрмінаў выкарыстоўваюцца наступныя спосабы: суфіксальны, прэфіксальны, прэфіксальна-суфіксальны, бяссуфіксны, аснова- і словаскладанне.

1. **Суфіксальны спосаб**. Гэты спосаб атрымаў найбольшае пашырэнне ў энергетычнай тэрміналогіі. У сучаснай беларускай літаратурнай мове прадуктыўнымі суфіксамі з'яўляюцца:

**- для назоўнікаў**: -нн, -енн (-энн), -к, -нік (-льнік), -асць, -чык (-шчык), -атар: *сілкаванне, разводка, уцяплядьнік, тэрмастойкасць, трубаправодчык, кандэнсатар* і інш.

- **для прыметнікаў**: -ан (-ян), -н, -ов (-ав), -ёв, -к, -льн, -ічн (-ычн): *электрамагнітны, нафтавы, тонкі, сілкавальны, электрычны* і інш.

- **для дзеясловаў**: -а (-я), -ы (-і), -ава (-ява), -ва, -ізава (-ызава): *герметызаваць, брыкетаваць, эканоміць* і інш.

2. **Прэфіксальны спосаб.** Пры дапомозе прыставак утварылася нязначная частка энергетычных тэрмінаў, напрыклад, *негерметычнасць, проціток, антыкатод, бескіслародны, проціаварыйны, падагрэць* і інш.

3. **Прэфіксальна-суфіксальны спосаб** - шляхам далучэння прэфікса і суфікса, напрыклад: *падшыпнік, бязмуфтавы, арудзянець* і інш.

4. **Бяссуфіксны спосаб** - шляхам адсячэння суфікса: *выгіб, знос, недагрэў, адсек, адкос, сплаў, сцёк, накіп, прарыў, напор, націск, зрух* і інш.

5. **Аснова- і словаскладанне**: *газабалон, токапрымальнік, водападагравальнік, нафтааддача* і інш.

**Семантычны спосаб** заключаецца ў тым, што з'яўленне новага тэрміна заснавана на пераасэнсаванні агульнаўжывальнага слова: *вусце (свідравіны), мука (тэктанічная), пояс (вышкі), рукаў (буравога шлангу), плячо (долата), ёрш (лавільны), башмак (трубны),* і інш.

**Сінтаксічны спосаб** утварэння з'яўляецца вельмі прадуктыўным у энергетычнай тэрміналогіі: *крыніца току, блок сілкавання, далёкая лінія электраперадачы, электрычная энергія, электрычны ланцуг, выкіды цеплавых электрастанцый* і інш.